

# Гродзенскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 8 (248) ● *3 лістапада 1997 года, панядзелак*

Выходзіць адзін раз у месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


АФІЦЫЙНА

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На вераснёўскім пасяджэнні рэктарата разглядалася пытанне аб сістэме размеркавання сродкаў ад платнай адукацыі. З інфармацыяй выступіў начальнік сектара платнай адукацыі Я.А. Роўба.

Пазабюджэтныя даходы, - сказаў дакладчык, - павялічваюцца. Сёлета на платнай форме навучання налічваецца 2696 студэнтаў. Адметна тое, што палавіна з іх - з юрыдычнага факультэта. На другім месцы па колькасці студэнтаў-платнікаў - факультэт эканомікі і кіравання, на трэцім - філалагічны. 38,5 мільярда рублёў будзе атрымана ад платнай адукацыі.

Як размяркоўваюцца гэтыя сродкі? Разлічаны кошт адукацыі, затраты з дакладнасцю да гадзіны на зарплату, адлічэнні на аплату працы, матэрыяльныя затраты (літаратура, базы дадзеных і г.д.). Сюды ж уваходзяць затраты на камандзіроўкі, стажыроўкі, практыку, на набыццё абсталявання, на арэнду памяшканняў - адным словам, на ўсё тое, што забяспечвае навучальны працэс.

Затым было абмеркавана палажэнне аб грамадскім савеце. Гэты савет створаны для кантролю і каардынацыі работы па платнай адукацыі. Заслухана інфармацыя прарэктара па АГР В.К. Ермака па падрыхтоўцы да зімы.

Разгледжаны таксама пытанні з раздзелу "Рознае".

* * *

На пасяджэнні рэктарата ад 6 кастрычніка была заслухана інфармацыя дэкана факультэта педагогікі і псіхалогіі В.П. Таранцея аб укараненні ў навучальны працэс вынікаў навукова-даследчай работы факультэта. Адзначалася, што факультэтам вядзецца пэўная арганізацыйная работа па ўкараненні вынікаў НДР. Створаны і дзейнічаюць навуковыя калектывы, выдаюцца вучэбныя дапаможнікі, напісаныя выкладчыкамі універсітэта. Так, нядаўна ўбачылі свет дапаможнік па псіхалогіі пад рэдакцыяй С.В. Кандрацьевай і праграма па трэнінгу В.А. Місцюк.

Праводзяцца навуковыя канферэнцыі, створаны і працуюць эксперыментальныя пляцоўкі. Дэкан факультэта В.П. Таранцей неаднаразова выступаў з публікацыямі на старонках абласной газеты "Гродзенская праўда", вёў цыкл перадач "Бацькі і дзеці" на абласным радыё.

Разам з станоўчым адзначаны асобныя недахопы ў рабоце ў гэтым напрамку.

**ЦИТАТА НОМЕРА:**

*"Уже то, что несмотря на невообразимую сложность мира, людям удается раскрыть кое-какие законы, является чудом".*

*Эрвин Шредингер*

## Рэктар С.А. Маскевіч



На пасаду рэктара Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта прызначаны выконваючы абавязкі рэктара Сяргей Аляксандравіч Маскевіч.

Прадстаўляем чытачам новага рэктара. С. А. Маскевіч нарадзіўся ў 1953 годзе ў весцы Быкаўка Шчучынскага раёна. Жанаты, у сям'і — двое сыноў. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут.

Пасля размеркавання застаўся працаваць тут жа, на родным фізіка-матэматычным факультэце. Завочна скончыў аспірантуру. Навуковая дзейнасць звязана з вывучэннем спектраскапічных характарыстык і электроннай структуры вытворных тыяміну.

С. А. Маскевіч — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, да прызначэння на пасаду рэктара працаваў прарэктарам па навуковай рабоце ГрДзУ.

* * *

**ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА**

Віншуем з юбілеем і нагадваем, калі і каго можна павіншаваць у лістападзе:

* 6 лістапада - *Надзею Рыгораўну* ***ХАЛЕЦКУЮ*** - бібліятэкара;

* 17 лістапада - *Уладзіміра Уладзіміравіча* ***КАШУБУ*** - рабочага;

* 21 лістапада - *Аляксея Аляксандравіча* ***КРУШАЛЬНІЦКАГА*** - старшага выкладчыка кафедры алгебры і геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі;

* 22 лістапада - *Ільсію Гумераўну* ***КРЫВАНОСАВУ*** - лабаранта 1 катэгорыі.

* * *

КАРОТКІМ РАДКОМ

### Калі ласка ў магістратуру

На базе універсітэта адкрыта магістратура. Тут праводзіцца навучанне па 9 спецыяльнасцях. Справа новая, але ўжо добра сябе зарэкамендавала.

Сёлета паступіла 18 заяў на 18 месцаў у магістратуры. Ужо на некаторыя спецыяльнасці аб'яўляецца конкурс. Самы вялікі конкурс — на эканамічныя спецыяльнасці.

### Цэнтр перападрыхтоўкі

Ва універсітэце дзейнічае філіял факультэта БДУ па перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў. Гэты філіял, або цэнтр перападрыхтоўкі кадраў, працуе нядаўна. Але ўжо ёсць вынікі: падрыхтаваны спецыялісты па заказу цэнтра занятасці насельніцтва. Яны праходзілі 9-месячную падрыхтоўку па спецыяльнасцях "Эканоміка", "Кібернетыка", "Бізнес і права".

Заняткі праходзяць у асноўным у нядзелю вечарам на базе універсітэта. Дзённыя - на базе хіміка-тэхналагічнага тэхнікума.

Для універсітэта цэнтр карысны тым, што назапашваецца нейкі вопыт у новых напрамках дзейнасці. Да таго ж выкладчыкі могуць атрымаць дадатковы заробак, а студэнты - павысіць узровень ведаў па такіх дысцыплінах, як замежныя мовы, спецыяльнасці камерцыйнай дзейнасці.

### Прысвячэнне ў студэнты

Стала ўжо традыцыйным у адзін з восеньскіх вечароў праводзіць абрад прысвячэння ў студэнты. Вось і сёлета гэтая традыцыя вылілася ў сапраўднае студэнцкае свята - свята песні, трапнага жарту.

Наогул, на гэты раз былі прадстаўлены ўсе жанры студэнцкага самадзейнага майстэрства - іспявалі, і танцавалі, і спрабавалі сябе ў драматычным жанры. Зал, як заусёды, сустракаў "на ўра" самадзейных артыстаў СТЭМа "Вернісаж". Яны і на гэты раз паказалі цікавую праграму, якая гледачам запомніцца. Асабліва - першакурснікам. Бо многія з іх такое бачылі ўпершыню. І так бурна смяяліся, і так доўга дарылі "Вернісажу" апладысменты.





## ОБРАЩЕНИЕ УЧАСТНИКОВ ПЕРВОГО ПЛЕНУМА ОБЛАСТНОГО КОМИТЕТА БПСМ К МОЛОДЕЖНЫМ ОРГАНИЗАЦИЯМ И ОБЪЕДИНЕНИЯМ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ

**Всех нас волнует настоящее и будущее нашей Отчизны, нашей родной Беларуси, наше будущее и будущее наших семей. Большую роль в тех преобразованиях, которые идут в обществе, должны сыграть молодежные организации и объединения. На сегодняшний день в областной организации Белорусского патриотического союза молодежи насчитывается 934 первичных организации, в которых состоят 9050 членов. Наряду с БПСМ в области действуют 27 молодежных организаций и объединений. Между ними не налажено сотрудничество, хотя многие направления работы перекликаются. Исходя из этого, мы призываем к сотрудничеству и взаимопониманию все молодежные организации и объединения Гродненской области. Мы убеждены, что только координация действий при соблюдении прав и интересов каждой организации создаст условия для развития всех молодежных организаций и объединений, обеспечит защиту прав и интересов молодежи.**

## О МИНИМАЛЬНОЙ ЗАРАБОТНОЙ ПЛАТЕ И ТАРИФНОЙ СТАВКЕ ПЕРВОГО РАЗРЯДА РАБОТНИКОВ БЮДЖЕТНОЙ СФЕРЫ

**Постановление Совета министров Республики Беларусь от 28 августа 1997 г., № 1124**

Совет министров Республики Беларусь постановляет:

1. Установить с 1 сентября 1997 года минимальную заработную плату в размере 200000 рублей в качестве норматива, обязательного для выполнения всеми нанимателями, а тарифную ставку первого разряда - 220000 рублей в месяц.

2. Министерству труда по согласованию с Министерством финансов ввести с 1 сентября 1997 г. доплаты к тарифным ставкам и окладам работников бюджетной сферы, тарифицируемых 1-14 разрядами, в размерах 335000-200000 рублей в месяц.

3. Министерствам и другим республиканским органам государственного управления, местным исполнительным и распорядительным органам, руководителям предприятий, учреждений и организаций, финансируемых из бюджета, обеспечить перерасчет заработной платы работников в соответствии с установленной настоящим постановлением тарифной ставкой первого разряда и коэффициентами Единой тарифной сетки работников Республики Беларусь.

4. Министерству обороны, Министерству внутренних дел, Комитету государственной безопасности, Министерству социальной защиты с 1 сентября 1997 г. произвести перерасчет пенсий исходя из нового размера минимальной заработной платы.

Руководителям высших, средних специальных и профессионально-технических учебных заведений пересмотреть размеры государственных стипендий.

5. Увеличить с 1 сентября 1997 г. в 1,33 раза назначенные до указанной даты в соответствии с законодательством пособия по безработице и стипендии гражданам, проходящим профессиональную подготовку (повышающим квалификацию) по направлению Государственной службы занятости.

6. Признать утратившим силу пункт 4 постановления Совета министров Республики Беларусь от 27 марта 1997 г. N 264 " О дальнейшем совершенствовании механизма оплаты труда в отраслях экономики" (Собрание декретов, указов Президента и постановлений правительства Республики Беларусь, 1997 г., № 9, ст. 340).

**Премьер-министр Республики Беларусь С. ЛИНГ.**

# О СТАВКАХ ПОДОХОДНОГО НАЛОГА

Постановлением Совета министров Республики Беларусь от 28 августа 1997 года N 1124 "О минимальной заработной плате и тарифной ставке первого разряда работников бюджетной сферы" установлена с 1 сентября 1997 года минимальная заработная плата в размере 200 000 рублей в месяц. В связи с этим Государственный налоговый комитет Республики Беларусь доводит до сведения шкалы ставок подоходного налога в цифровом изложении.

1. С доходов, указанных в статьях 7 и 9 Закона Республики Беларусь "О подоходном налоге с граждан", подоходный налог взимается в следующих размерах:

| Размер облагаемого месячного дохода | Сумма налога |
|---|---|
| 1. До 2.000.000 рублей | 9% с суммы дохода |
| 2. От 2.000.001 до 3.000.000 рублей | 180.000 руб. + 12% с суммы, превышающей 2.000.000 рублей |
| 3. От 3.000.001 до 4.000.000 рублей | 300.000 руб. + 15% с суммы, превышающей 3.000.000 рублей |
| 4. От 4.000.001 до 6.000.000 рублей | 450.000 руб. + 20% с суммы, превышающей 4.000.000 рублей |
| 5. От 6.000.001 до 12.000.000 рублей | 850.000 руб. + 25% с суммы, превышающей 6.000.000 рублей |
| 6. От 12.000.001 до 14.000.000 рублей | 2.350.000 руб. + 30% с суммы, превыщающей 12.000.000 рублей |
| 7. От 14.000.001 рублей и выше | 2.950.000 руб. + 50% с суммы, превышающей 14.000.000 рублей |

2. С доходов, указанных в статьях 10, 11, 13 Закона, а также при исчислении налога исходя из совокупного годового дохода, подоходный налог взимается в следующих размерах:

| Размер годового облагаемого дохода | Сумма налога |
|---|---|
| 1. До 19.400.000 рублей | 9% с суммы дохода |
| 2. От 19.400.001 рубля до 29.100.000 рублей | 1.746.000 рублей + 12% с суммы, превышающей 19.400.000 рублей |
| 3. От 29.100.001 рубля до 38.800.000 рублей | 2.910.000 рублей + 15% с суммы, превышающей 29.100.000 рублей |
| 4. От 38.800.001 рубля до 58.200.000 рублей | 4.365.000 рублей + 20% с суммы, превышающей 38.800.000 рублей |
| 5. От 58.200.001 рубля до 116.400.000 рублей | 8.245.000 рублей + 25% с суммы, превышающей 58.200.000 рублей |
| 6. От 116.400.001 рубля до 135.800.000 рублей | 22.795.000 рублей + 30% с суммы, превышающей 116.400.000 рублей |
| 7. От 135.800.001 рубля и выше | 28.615.000 рублей + 50% с суммы, превышающей 135.800.000 рублей |

Обращаем внимание, что ставки применяются:

- к заработной плате и другим выплатам, связанным с исполнением трудовых обязанностей (в том числе за работу по совместительству), за работы, выполненные с 1 сентября 1997 года;
- к доходам за выполнение разовых работ и других работ, осуществляемых на основе договоров гражданско-правового характера, начисленных после 1 сентября 1997 года;
- к доходам от предпринимательской деятельности при исчислении подоходного налога, начиная с расчетов за III квартал 1997 года;
- к другим доходам при исчислении налога после 1 сентября 1997 года.

**Заместитель председателя Государственного налогового комитета Республики Беларусь М. ЕФИМОВИЧ.**



Конкурс

## НА ЛЕПШЫ ТЛУМАЧАЛЬНЫ ТЭКСТ ДА ДЗЯРЖАЎНЫХ СІМВАЛАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Распараджэннем кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 1995 г. зацверджана палажэнне аб конкурсе на лепшы тлумачальны тэкст да Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Галоўнай мэтай конкурсу з'яўляецца найбольш поўнае раскрыццё сэнсу і значэння цяперашніх дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь у цэлым, а таксама асобных іх элементаў.

Тлумачальныя тэксты да Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь павінны ўтрымліваць падрабязнае тлумачэнне гістарычнага, культурнага і эстэтычнага сэнсу і зместу ўсіх элементаў герба і сцяга. Гэтыя тэксты не павінны перавышаць у машынапісу аднаго аўтарскага аркуша. Тэкст пазначаецца дэвізам, да якога павінен быць прыкладзены запячатаны канверт з поўнымі дадзенымі пра аўтара. Работы, якія не адпавядаюць мэце конкурсу, афармленыя з парушэннем указаных патрабаванняў, а таксама адпраўленыя пасля 1 мая 1996 г., разглядацца не будуць.

Тэкст можа быць на беларускай або рускай мове.

Для пераможцаў конкурсу ўстанаўліваюцца: дзве першыя прэміі - у памеры 50 мінімальных заработных плат кожная; дзве другія прэміі - у памеры 30 мінімальных заработных плат кожная.

Устанаўліваюцца таксама памятныя прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для заахвочвання аўтараў найбольш арыгінальных работ.

Аўтарскі тэкст пераможцы конкурсу будзе выдадзены ў выглядзе маляўнічай брашуры.

Конкурс праводзіцца да 1 мая 1996 года. Яго вынікі будуць падведзены і аб'яўлены да 12 мая 1996 г.

Матэрыялы на конкурс накіроўваць на адрас:
220016, г. Мінск, вул. К.Маркса, 38, з адзнакай:
"На конкурс".

## ПЛАН ИЗДАНИЯ СВЕРСТАН

Обеспеченность учебного процесса учебной, учебно-методической литературой оказывает влияние на подготовку студентов, на их знания, облегчает работу профессорско-преподавательского состава. Поэтому, как и в прошлые годы, был разработан тематической план-заявка издания учебной, учебно-методической литературы на 1996 год.

К ноябрю 1995 года в учебно-методический отдел поступило 185 заявок на 574 печатных листа. Наибольшее количество заявок поступило от физико-технического факультета - 124 печатных листа; 100 печатных листов - от факультета права и экономики; 94 - психологии и педагогики; 90 - истории и культуры; 67 - от факультета иностранных языков; 39 - от математического факультета; 31 - филологического; 30- от факультета физической культуры; 9 печатных листов - от факультета биологии и экологии.

Все заявки были согласованы с библиотекой и издательским отделом, предварительный план-заявка был детально обсужден на заседании РИСа. Ученым Советом университета утвержден тематический план-заявка на 53 позиции (187,5 печатных листа), исходя из возможностей редакционной группы. В план не были включены те заявки, рукописи по которым предлагалось представить позже октября 1996 года, отклонялись заявки тех авторов, которые из года в год не представляли рукопись в нужные сроки, а также те работы, в которых члены РИСа считали необходимым уточнение или переработку заявки, или имело место наличие аналогичной уже изданной литературы.

Несмотря на то, что некоторые заявки не вошли в план, авторы, подготовившие рукописи, получившие все необходимые отзывы и рецензии, могут представлять их в РИС для рекомендации их к изданию.

В ближайшее время будут подготовлены новые правила прохождения рукописей, предоставления планов-проспектов заявленных изданий и новое положение о РИСе.

***Т.БАДЮКОВА,***
***начальник учебно-методического отдела.***

## *Прысвячаецца А. Карпюку*

У мінулым годзе кафедра польскай філалогіі выдала ў свет матэрыялы III-й міжнароднай канферэнцыі "Польская мова і літаратура ў кантэксце славянскіх культур". Гэта кніга выдадзена ў памяць Аляксею Нічыпаравічу Карпюку. На трох мовах (рускай, беларускай, польскай). Кніга дзеліцца на два раздзелы: літаратуразнаўства і мовазнаўства. У ёй прадстаўлены даклады як сусветна вядомых вучоных-прафесараў В. Хорава і С. Шарлаімавай (Масква), Ю. Бахужа і М. Чэрміньскай (Гданьскі універсітэт), прафесараў Кракаўскай Вышэйшай педагагічнай школы Г. Бурштыньскай і Ст. Бурката, загадчыка сектара беларускай і украінскай культуры АН Расіі Ю.Лабынцава, прафесара Я. Насовіча (філіял Варшаўскага універсітэта), так і работы беларускіх вучоных. Шырока прадстаўлены, у прыватнасці, Гродзенскі універсітэт: вядомыя даследчыкі С. Мусіенка, А. Пяткевіч, І. Жук і маладая плынь у навуцы і дыдактыцы нашага універсітэта - студэнты 5 курса аддзялення польскай філалогіі: В.Курловіч, І. Хластоўская.

У кнізе даследуюцца працэсы развіцця польскай мовы, літаратуры, культуры XIX - XX ст.ст. і іх сувязі з роднаснымі славянскімі культурамі. У кнізе аналізуюцца моўныя і літаратуразнаўчыя асаблівасці Гродзенскага рэгіёна - зямлі шчодрай і багатай на таленты і культурную спадчыну народаў, якія жывуць тут адвеку.

***Н. ПЯТРОВА.***

## Вам неабходна даведка? Калі ласка, у новы цэнтр!

Ён створаны ў канцы мінулага года на базе даведачна-інфармацыйнага аддзела бібліятэкі. Яго мэта - забеспячэнне навуковага, навукова-даследчага і навучальна-выхаваўчага працэсаў інфармацыяй аб найноўшых айчынных і замежных распрацоўках, перадавым вопыце; аб канферэнцыях, сімпозіумах, семінарах, выставах, аб наяўнасці літаратуры па той ці іншай галіне.

Адна з галоўных задач нашага цэнтра - вывучэнне інфармацыйных запатрабаванняў прафесараў, выкладчыкаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, аспірантаў і студэнтаў, каб больш рацыянальна камплектаваць і папаўняць даведачна-інфармацыйны фонд універсітэта, каардынаваць інфармацыйную дзейнасць ГрДУ.

Што на сённяшні дзень ёсць у нашым даведачна-інфармацыйным цэнтры? ДІЦ арганізуе сваю працу на базе універсітэцкага фонду навукова-тэхнічнай і інфармацыйна-даведачнай літаратуры, перыядычных выданняў Рэспублікі Беларусь, Расіі і іншых краін, міжнародных цэнтраў і фондаў. Ёсць сістэматычны каталог і сістэматычная картатэка артыкулаў у часопісах і кнігах, якія маюцца ў наяўнасці ў фондзе бібліятэкі па розных галінах ведаў. Вядзецца работа па стварэнню электроннага кніжнага каталога, які дазволіць атрымаць інфармацыю тэкстаўю або на дыскеце. Ужо сёння чытачы нашай бібліятэкі маюць магчымасць карыстацца шырокай электроннай інфармацыяй аб літаратуры па педагогіцы, псіхалогіі, мовазнаўству і іншых навуках.

Сумесна з вылічальным цэнтрам і лабараторыяй інфармацыйных тэхналогій і сродкаў тэлекамунікацыі універсітэта ДІЦ фармуе базы дадзеных навукова-тэхнічнай інфармацыі на магнітных і аптычных носьбітах. Зараз у нашым цэнтры маюцца наступныя базы дадзеных: CURRENT CONTENTS - уся інфармацыя на дыскетах аб наяўнай літаратуры па матэматыцы, фізіцы, хіміі, а таксама па біятэхналогіі (з мая 1995 года);

Life Sciences Collection - інфармацыя аб літаратуры па біялагічных навуках з 1990 па верасень 1995 г. на СД -ROM;

Linguistics Language Behvior Abstracts - інфармацыя аб літаратуры па мовазнаўству на СД РОМ з 1973 па ліпень 1995 года.

Нагадаю, што даведачна-інфармацыйны цэнтр размяшчаецца ў галоўным корпусе універсітэта, на першым паверсе, у аўдыторыі 116а. Будзем рады аказаць дапамогу нашым наведвальнікам у пошуку патрэбнай інфармацыі. Аднак і без вашай дапамогі нашаму цэнтру не абысціся. Згодна палажэнню аб ДІЦ мы патрабуем і будзем патрабаваць ад падраздзяленняў і кафедраў неабходныя цэнтру матэрыялы і звесткі, будзем прыцягваць да работы ў якасці кансультантаў прафесараў і выкладчыкаў універсітэта, будзем даручаць работнікам ГрДУ, камандзіраваным у іншыя вну на канферэнцыі, семінары, выставы, каб яны прывозілі адтуль неабходную нашаму цэнтру інфармацыю. Работа па назапашванню базы дадзеных прадстаіць вялікая і грунтоўная. Спадзяёмся на ўзаемаразуменне і падтрымку, бо ў канчатковым выніку плён ад гэтай працы будзе відавочным.

***Ф. ЛЯЛЬЧУК,***
***загадчыца даведачна-інфармацыйнага цэнтра.***



# ЁН КРОЧЫЎ НА ПАРАДЗЕ ПЕРАМОГІ

Вайна застала яго ў Кіеўскім артылерыйскім вучылішчы. Маладзенькі лейтэнант, камандзір узвода Харытонаў трымаў абарону пад Масквой, пазней удзельнічаў у баях пад Сталінградам, дзе ў студзені 43-га быў паранены. Невялічкая перадышка ў шпіталі і з лета - зноў на фронт. Толькі гэта было ўжо пераможнае шэсце Чырвонай Арміі па роднай зямлі, і Анатоль Харытонаў - "маленькі вінцік" вялікага ваеннага механізму, ужо не проста абараняў, а вызваляў ад фашысцкай навалы Данбас (тут на гадзінку нават заскочыў у бацькоўскую хату), пасля - Мелітопаль і Херсон, Крым, Севастопаль, Беларусь, Літву, Усходнюю Прусію. Камандзіру батарэі, а пасля начальніку разведкі 113-га гвардзейскага знішчальнага супрацьтанкавага палка, яму не прыходзілася хавацца за чужыя плечы. Не за прыгожыя вочы давалі баявыя ўзнагароды. А іх у Харытонава шмат: чатыры ордэны Айчыннай вайны, два ордэны Чырвонай Зоркі, 15 медалёў, сярод іх "За абарону Сталінграда", "За ўзяцце Кёнігсберга". Дарэчы, медаль "За перамогу над Германіяй" падмацавана пасведчаннем N 1511 у чырвоных вокладках. Па іх колеру можна здагадацца: уладальнік узнагароды - удзельнік Парада Перамогі.

Вось як успамінае ветэран дні, што папярэднічалі гэтай падзеі:

- Германія капітулявала. Наш полк размясціўся пад Кёнігсбергам. Жылі ў шыкоўных нямецкіх маёнтках, з дня на дзень чакалі адпраўкі дамоў. Ды недзе 25 мая мяне выклікалі ў штаб арміі, загадалі - з рэчмяшком. Нас сабралася чалавек 100 афіцэраў і радавых. Усе высокія, з выгляду здаровыя, з узнагародамі, але ніхто не разумеў - навошта збор? Павезлі нас у Кёнігсберг, пасялілі ў казармы, на голыя нары. Пасля тае пярыны, што кароткі час песціла ў маёнтку, тут было не салодка, зноў, як на вайне. Узмоцненая страявая падрыхтоўка на майскай спякоце ад цямна і да цямна - не вялікая ўцеха... Так працягвалася некалькі дзён. Пасля ўсім выдалі новае шэрае абмундзіраванне, і аднойчы вечарам паднялі нас па трывозе. Полк накіраваўся на ўшчэнт разбураны чыгуначны вакзал. Размясцілі ўсіх у санітарныя вагоны, ноч ехалі, не разумеючы, ў якім напрамку, а раніцай высветлілася, што едзем па літоўскай зямлі. Пасля на шляху быў Мінск, які ўразіў сваімі руінамі і, што асабліва кранула, - да паяздоў падыходзілі натоўпы абарваных галодных жабракоў і ледзь жывых дзяцей, яны спадзяваліся на кавалачак цукру ці скарынку хлеба. Доўга эшалон манеўраваў у Оршы і, нарэшце, адкрыўся шлях...на Маскву. Тады і папаўзла чутка, што, мусіць, усім спадарожнікам пашчасціла прайсці ў ганаровым пераможным шэсці...



*Гэты здымак быў зроблены за некалькі дзён да ўрачыстага Парада Перамогі. Капітан Харытонаў - у тым самым навюткім мундзіры, пры тых узнагародах (пяць баявых ордэнаў!), што прайшоў па Чырвонай Плошчы 24 чэрвеня 45-га. І праз паўстагоддзя сэрца ветэрана не-не, ды і ўздрыгне ад таго моцнага і складанага пачуцця, што тады перапаўняла душу. У ім - перажыты жах і боль за спаленыя гарады і смерць сяброў, гонар за Айчыну, прага жыцця - мірнага і шчаслівага, жаданне прыхінуцца да матчынай шчакі, як некалі ў дзяцінстве...*

Іх зводны полк размясцілі ў адным з ваенных вучылішчаў Падмаскоўя. Павітаць будучых удзельнікаў Парада прыехаў камандуючы 1-ым Прыбалтыйскім фронтам маршал Баграмян. І пайшлі дні і ночы падрыхтоўкі. У светлы час сутак "рэпетыравалі" на лузе, а калі засынала Масква, яны выгружаліся на Бутырскай плошчы і да раніцы адпрацоўвалі крок і рух.

Незадоўга да Парада атрымалі новую форму, начышчалі клінкі і медалі, падшывалі ўзнагароды, каб, не дай бог, у час маршу не адшпіліліся. Першапачаткова меркавалася, што парад пройдзе 22 чэрвеня, роўна праз чатыры гады ад пачатку вайны, але сіноптыкі перадалі несуцяшальны прагноз надвор'я, і Парад Перамогі перанеслі яшчэ на два дні.

"Генеральная рэпетыцыя" прайшла на аэрадроме. Папярэдне прымалі "парад" маршалы Жукаў і Ракасоўскі. І вось, нарэшце,той доўгачаканы дзень - 24 чэрвеня. Неба з раніцы зацягнула хмарамі, а перад самым выездам маршала Жукава пачаў марасіць дождж. Ледзь грымнуў тысячай трубаў аркестр, як неба быццам бы прарвала і пайшоў сапраўдны дождж. Але нават гэта непрыемная акалічнасць не магла сапсаваць прыўзнятага настрою ўдзельнікаў Парада. Прайшлі з пачуццём годнасці, выразна і ўпэўнена адбіваючы крок, быццам не мелі ні раненняў, ні душэўных ран. А што пасля з ботаў нават ваду вылівалі - дык гэта дробязь у параўнанні з тым, што зведалі ў той жудаснай вайне...

Некалькі пасляваенных гадоў Анатоль Андрэевіч служыў яшчэ ў Арміі, а пасля па стану здароўя вымушаны быў развітацца з афіцэрскай пасадай. Ужо ў даволі сталым узросце (падрасталі дзеці),ён закончыў гістарычны факультэт пединститута і з 1960 года працуе ў нас. Выдатнік асветы. Займаў розныя пасады, і ўсюды адрознівалі яго добрасумленныя адносіны да справы, дысцыплінаванасць і сціпласць. І зараз, даўно атрымаўшы права на заслужаны адпачынак, ён штодзень спяшаецца на кафедру эканомікі і кіравання, бо не ўяўляе сябе без справы, без людзей. Большая частка яго змястоўнага жыцця звязана з нашым універсітэтам, тут у яго шмат сяброў, і штодзень - нібы сустрэча з далёкім юнацтвам. Ці ж даўно быў ён такі вось, як гэтыя хлопцы-студэнты, поўны аптымізму і ўзнёслых прадчуванняў? Але ж хіба не спраўдзіліся яны? Вось ужо час нібыта старыя ваенныя раны зарубцаваў, пасталелі сыны - яго гонар і працяг. Унукі, як вясновыя парасткі, радуюць сэрца. За гэта і варта было некалі рызыкаваць жыццём.

*С.МУРЫНА.*



# СЕСІЯ, СЕСІЯ, СЕСІЯ...

Непрыкметна праляцелі навагоднія калядныя святы, а за імі крочаць выпрабаванні для тудэнтаў і выкладчыкаў - зімовая экзаменацыйная эсія.

Цішэй стала ў калідорах, аўдыторыях, студэнты талі больш сур'ёзнымі, хвалююцца: экзамены ёсць



кзамены... Дзе толькі не ўбачыш студэнта: і на адаконніку, і на лесвіцы, і проста прытуліўшыся да цяны. Сесія ідзе поўным ходам.

Ці плённа працавалі студэнты на працягу семестра, як справяцца з экзаменацыйнымі заданнямі - пакажуць вынікі. А пакуль рэдакцыя зычыць і студэнтам стацыянара, і завочнікам шчаслівых білетаў, выкладчыкам -таленавітых вучняў, а ўсім - традыцыйнае: ні пуха, ні пяра!



**P.S.** Напэўна, калі нумар газеты выйдзе ў све сесія будзе завершана і студэнты будуць адпачываць. е мы вернемся да надрукаванага і раскажам у насту ым нумары аб выніках зімовай экзаменацыйнай сесі.

*На здымках: сесія ва універсітэце.* ***Фота А.ПЯТРОВА.***

## ДЛЯ НАВУЧАННЯ Ў МАГІСТРАТУРЫ УНІВЕРСІТЭТАЎ ЗША

Як паведаміла газета "Рэспубліка", па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Міністэрства адукацыі і навукі нашай раіны сумесна з амерыканскім саветам (ASSEBS) аб'явіла конкурс а атрыманне стыпендый для навучання ў магістратуры універсітэтаў лучаных Штатаў Амерыкі, пачынаючы з восені 1996 года, па пецыяльнасцях "Кіраванне бізнесам" і "Міжнароднае права".

Удзел у конкурсе могуць прыняць нашы суайчыннікі ўзростам да 35 адоў. Абавязковая ўмова - веданне англійскай мовы, вышэйшая дукацыя і вопыт работы ў адпаведных галінах.

Шчаслівчыкі па заканчэнні курса навучання абавязаны адпрацаваць ры гады на дабрабыт Беларусі.

## СТУДЭНТЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Студэнты аддзялення МЭА зарэгістравалі ініцыятыўную групу Міжнароднай арганізацыі студэнтаў-эканамістаў (AIESEC). Гэта другая ў Беларусі студэнцкая суполка, якая паспрыяе аб'яднанню студэнтаў розных краін, дапаможа будучым выпускнікам вну хутчэй знайсці работу, мець магчымасць міжнародных стажыровак і г.д. Ініцыятыўная група запрашае ўсіх жадаючых студэнтаў універсітэта (інжынераў, фізікаў, матэматыкаў, біёлагаў, філолагаў і інш.) далучацца да міжнароднага супрацоўніцтва, што дазволіць загадзя ўсталяваць замежныя кантакты, больш упэўнена ўступаць у самастойнае жыццё выпускнікам.

## НАВУКОЎЦЫ - ВЫТВОРЧАСЦІ

Вынікам плённай працы на кафедры матэрыялазнаўства і рэсурсазберагальных тэхналогій пад кіраўніцтвам В.А.Струка стала распрацоўка кампазіцыйнага матэрыялу на аснове арганічных і неарганічных палімераў для вытворчасці абразіўнага інструмента ў рамках рэспубліканскай праграмы "Алмазы". Выпрабаванні паказалі, што нашы універсітэцкія доследы даволі сталыя і мэтазгодна выкарыстоўваць іх у вытворчасці. На жаль, нашы гродзенскія прадпрыемствы не маюць сродкаў на асваенне, таму вытворчасць абразіўнага інструмента ў шырокім асартыменце (больш дзесяці тыпапамераў) будзе створана ў адной са сталічных фірм.

Ужо відавочна, што паспяхова завяршацца на "Азоце" выпрабаванні распрацовак кафедры, накіраваных на павышэнне зносаўстойлівасці вузлоў трэння ў агрэсіўных умовах эксплуатацыі. Працягваюцца яны ўжо 4 месяцы, іх папярэднія вынікі задавальняюць і стваральнікаў - універсітэцкіх вучоных, і спецыялістаў вытворчасці.

***С.БЕРАСТ.***

Раскопы

## НАЗЫВАЛІ ЦАРКВУ ВАСКРАСЕНСКАЙ

Другі год студэнты факультэта гісторыі і культуры праходзілі археалагічную практыку на раскопках Новага замка ў Гродне. Упершыню гэты цікавейшы помнік археалогіі, гісторыі і архітэктуры даследаваўся А.К. Краўцэвічам у 1987 годзе, калі на паўднёва-заходняй частцы гары быў закладзены невялікі раскоп. Тады быў атрыманы цікавы матэрыял, які сведчыў аб наяўнасці на тэрыторыі Новага замка ў XII ст. царквы, збудаванай з цэглы-плінфы.

У 1994 годзе на заходняй частцы гары, за будынкам філіі Гродзенскага Нацыянальнага дзяржаўнага гістарычнага архіва,быў закладзены невялікі раскоп плошчай 60 кв. м. За два гады працы быў атрыманы цікавы археалагічны матэрыял, адкапана частка каменнай маставой Новага замка канца XVIII - пачатку XIX стагоддзяў. Сярод археалагічных знаходак найбольшую цікавасць прадстаўляюць гліняныя пліткі падлогі XII ст., пакрытыя шкляной палівай зялёнага, жоўтага і карычневага колеру. Наяўнасць гэтых плітак сведчыць аб тым, што падлога царквы XII ст. была выкладзена і ўпрыгожана імі (у такім жа стылі былі зроблены падлогі Ніжняй царквы на Старым замку, Прачысценскай і Каложскай, Барыса-Глебскай царквы). На жаль, пісьмовыя крыніцы не данеслі да нас звестак аб самой царкве, толькі ў XVI ст. нагадваецца царква, руіны якой стаялі насупраць брамы Старога замка (на тэрыторыі Новага замка) і называлі гэтую царкву Васкрасенскай. Вельмі цікавыя і знаходкі фрагментаў арнаментаваных касцяных накладак XII ст., шмат такіх накладак было знойдзена пры раскопках Старога замка, выкарыстоўваліся яны ў аздабленні зброі, прылад працы і быту.

У 1996 годзе плануецца працяг раскопак на тэрыторыі Новага замка, спадзяюся, што новы сезон прынясе новыя цікавыя знаходкі, а студэнты, якія будуць праходзіць практыку, сваімі рукамі дакрануцца да старажытнай гісторыі нашага горада.

***Р.АКІНЧЫЦ,***
***кіраўнік раскопак.***

***Ад рэдакцыі:*** *чакаем наступнага лета і мы, каб сваімі вачыма ўбачыць сляды сівой даўніны ў раскопе. Абавязкова там пабываем і раскажам у газеце аб знаходках археолагаў і сваіх уражаннях больш падрабязна.*

ВЫПУСК 1

# ИНСАЙТ
(озарение)



ГАЗЕТА В ГАЗЕТЕ

**Представляем вниманию читателей материалы, подготовленные кафедрой психологии. Надеемся, они будут интересны и студентам, и преподавателям. Планируется и впредь практиковать такие выпуски, так как психологам уже сегодня есть о чем рассказать, хотя подготовку по этой специальности университет ведет сравнительно недавно. О чем будет разговор? О дне сегодняшнем, о перспективах, проблемах и путях их решения. Будут публиковаться также материалы известных психологов на темы, интересующие широкий круг читателей.**

## КАФЕДРА ПСИХОЛОГИИ: ВЧЕРА, СЕГОДНЯ, ЗАВТРА...

**С. КОНДРАТЬЕВА,**
**зав. кафедрой психологии, действительный член Академии педагогических и социальных наук, доктор психологических наук, профессор**

### ВЧЕРА...

Оно у меня началось в августе 1979 года. Я застала в Гродненской области всего двух психологов. Орлова Н.Т. через год ушла на пенсию, а спустя некоторое время Белохвостова С.В. прошла по конкурсу на должность заведующей кафедрой психологии Гродненского областного ИУУ. Однако ректор Бодаков Александр Васильевич был настроен оптимистически: "Будем создавать факультет психологии". Слушая эти бодрые речи, я уныло думала: "И зачем меня сюда понесло?" И все-таки... Да что там говорить! Взялись мы за работу, в результате которой на сегодняшний день в области работают около 300 психологов. Можно было бы провести специальные исследования, чтобы понять, как произошло невероятное.

Ох, как негладко все шло! Все аспиранты первых лет не имели психологического образования (а психология - наука фундаментальная,

*(Окончание на 8 стр.)*

## ГИМН ПСИХОЛОГОВ

**Впервые прозвучал в Кировском районе Санкт-Петербурга**

*Есть много терминов хороших,*
*Есть очень много важных тем,*
*Но интереснее, чем личность,*
*Вы не найдете, между тем,*
*среди проблем.*
*Личность - ты иерархия мотивов,*
*Личность - ты субъективный образ Я,*
*Личность - ты порожденье коллектива,*
*А может, личность - ты просто высший судия!*
*Единство рода ты и вида,*
*Ты целое, а также часть.*
*Не совпадаешь с индивидом,*
*Но и не дашь ему пропасть.*
*Что за напасть!*
*Личность - быть может, ты продукт общенья,*
*Личность - быть может, деятельность ты,*
*Личность - ты совокупность отношений,*
*А может, личность - ты гений чистой красоты!*
*Быть может, время не пробило*
*Тебя на части разложить.*
*Единство рода ты и вида,*
*Но до тебя нам не дожить.*
*Не дослужить!*
*Личность - скажите, что это такое?*
*Личность - ты мировым проблемам мать.*
*Личность - ты никому не дашь покоя.*
*Откройся, личность, скажи нам, как тобою стать.*

## "ПРАКТИЧЕСКАЯ ПСИХОЛОГИЯ"

**А. ЯНЧИЙ,**
**аспирантка II курса**

Под таким названием вышло научно-методическое пособие для школьных психологов, учителей и студентов. Это первое крупное коллективное издание нашей кафедры психологии в городе Минске. Авторский коллектив возглавляет профессор С.В. Кондратьева.

Особенностью этого пособия является то, что оно представляет собой внедрение результатов научных исследований в практику работы школьных психологов.

В пособии даются рекомендации по формированию социально перцептивных умений учителя, развитию педагогической рефлексии, разрешению конфликтных ситуаций, коррекции самооценки учащихся и др. Едва ли не впервые представлена обстоятельная характеристика метода психологического анализа. Кроме того, в пособии даются советы по изучению семьи и налаживанию взаимоотношений в семье, диагностики детей с отклонениями в развитии, диагностики и коррекции психологической готовности детей к школьному обучению.

Пособие вышло под грифом Министерства образования РБ. Надеемся, что оно скоро поступит в продажу.

## Детский центр

**Н. МУРИНОВА,**
**старший преподаватель**

Центр развития творческих способностей детей при детском саде № 98 расположен в живописном месте нашего города на берегу Немана в районе Румлева, окружен вековыми дубами, широколиственными кленами, стройными березами. Кажется, сама природа выбрала место для детского центра, где осуществляется с раннего детства гармоническое развитие всех сторон личности маленького человека.

Каждое утро, вот уже пятый год, Центр развития ласково встречает детей. В распоряжении ребят бассейн, спортивный и музыкально-хореографический залы, кабинет массажа, физиолечебница, изостудия и фитосалон. Забота о развитии и здоровье ребенка начинается с искренней открытости перед детьми и спокойного, уважительного к ним отношения всего коллектива Центра. Если дети растут в атмосфере добра и любви, у них возникают положительные эмоции и переживания, отчего дети растут спокойными и веселыми, уверенными в себе, встречая мир открытой улыбкой.

Создавая оптимальные условия для умственного воспитания, развития познавательных творческих способностей детей, коллектив педагогов осуществляет постоянный поиск новых форм и методов воспитательно-образовательного процесса.

Здесь малыши с 2-летнего возраста обучаются английскому языку, развивают чувство ритма, пластику, красоту движений на занятиях по хореографии; знакомятся с математикой, азбукой, удивительными волшебными головоломками из чисел и фигур, развивая смекалку и логику мышления; путешествуют по сказочному "Букваринску". Здесь знакомят детей с прекрасным миром слова, развивают любознательность, внимание, память, знакомят с волшебными красками радуги, царством холодных и теплых тонов.

Огромное внимание уделяется индивидуальному подходу, тщательному изучению возможностей и психологических особенностей каждого ребенка. Эту работу осуществляют педагоги под руководством практического психолога Центра, что помогает им развить природные способности и дарования детей, воспитывать в гармоничном сочетании с окружающим миром.

Центр развития творческих способностей детей дошкольного возраста при детсаде № 98 является базой практики студентов психологического отделения.

Студенты проводят психодиагностические обследования детей, посещают занятия по психогимнастике, развивающие занятия, сенсомоторно-моторные тренинги. Будущие психологи участвуют в заседаниях психологического факультета для родителей будущих первоклассников, а также в заседаниях психологического клуба для сотрудников Центра.

Такие виды работы способствуют умению применять теоретические знания на практике, формируют навыки и умения практического психолога.



*(Окончание. Начало на 7 стр.).*

# КАФЕДРА ПСИХОЛОГИИ: ВЧЕРА, СЕГОДНЯ, ЗАВТРА...

с высокой степенью точности, математическая). Некоторые из них оказывались лодырями (а у меня не доставало характера их прогнать: да и где взять лучше?). Другие (это уже позже) бросились за длинным рублем. А третьи в обиде на меня (видно, было за что!), перешли на другую кафедру (правда, теперь мы снова плодотворно сотрудничаем). Однако были и четвертые — те, что остались и по сей день работают рядом...

Но пока мы размышляли о своей готовности выпускать психологов, Александр Васильевич поставил нас перед фактом: был объявлен набор на биофак со специализацией "Практическая психология" и одновременно организованы 9-месячные курсы переподготовки практических психологов. Мы были смущены, особенно сокрушалась обязательная и всенадежнейшая Т.К. Комарова ... Да куда денешься? Засучили рукава!

Но Александр Васильевич не дремал. Спустя два года специализацию заменил специальностью. Большинство выпускников специальности "Биология и практическая психология" пошли работать школьными психологами.

Наконец, четыре года назад мы ввели специальность "Психология". На этот раз никто не возмущался: привыкли. Учебный план по этой специальности соответствует международному стандарту подготовки профессиональных психологов в классических университетах. Мы изучили опыт подготовки классических психологов в Москве, Санкт-Петербурге, Вильнюсе, Ярославле, Мюнхене, Лодзи. В разработке учебного плана огромную работу выполнил зам.декана по отделению психологии доцент Б.П. Ковалев.

## СЕГОДНЯ...

В процессе подготовки профессиональных психологов мы ставим следующие задачи:

1. Развитие у студентов способности к видению психологической реальности. Речь идет не столько об умении вычленять факты психической жизни человека и группы (действия, поступки, события), сколько об умении видеть за ними скрытые закономерности психической деятельности, проникать в ее мотивы, неосознаваемые ею чувства и побуждения, прослеживать противоречивый процесс развития и саморазвития психики, анализировать и прогнозировать ее жизненный путь.

2. Развитие способности к профессиональному общению, которое предполагает творческое понимание другого человека, т.е. "открытие" его неповторимого своеобразия, наличие психологической позиции, направленной на диалогическое взаимодействие с другими людьми, владение психотехниками общения.

3. Развитие умений самостоятельного экспериментально-теоретического исследования и психопрактической деятельности. В решении данной задачи необходимо добиться, чтобы студенты понимали, что технология исследования должна быть подчинена искусству интерпретации экспериментальных данных, проникновения во внутреннюю психическую жизнь человека, мотивы деятельности и поведения, внутреннее отношение к задачам, постижения психологической сущности событий жизни другого человека и своей собственной.

4. Воспитание способности к саморазвитию, профессионально-личностному самосовершенствованию, формирование психологически грамотного отношения к построению программы собственной жизни.

5. Развитие педагогических способностей к преподаванию психологии в средних и высших учебных заведениях.

Сегодня у нас уже 150 студентов стационара, 42 заочного отделения, 3 студента получают второе высшее образование. А.В. Бодаков, пожалуй, обладает даром предвидения: мы на пороге открытия факультета психологии. Надеемся, это произойдет на следующий год.

Члены кафедры стали разворотливыми, высокоинициативными. Ведется большая научная работа, о которой мы подробно расскажем в следующих номерах газеты, а также учебно-методическая работа. Выпускаем учебные пособия, методические рекомендации, учебные программы. Разрабатывается большое количество уникальных учебных курсов. К их чтению привлечены, кроме штатных преподавателей кафедры психологии, лучшие специалисты университета и города. Это знаток психологии, доктор юридических наук, профессор Зорин Г.А., кандидат юридических наук, доцент Шиханцов Г.Г. (окончил юридический и психологический факультеты Санкт-Петербургского университета), зав. кафедрой психотерапии и медицинской психологии доктор медицинских наук профессор Е.Г. Королева, кандидат психологических наук, ведущий сотрудник института биохимии Н.П. Канунникова, доктор медицинских наук профессор С.Г. Обухов, кандидат психологических наук, доцент С.В. Белохвостова и другие уникальные специалисты. Они читают клиническую психологию, психиатрию, юридическую психологию, ведут универсальные тренинги (кандидат психологических наук Г.Ф. Михальченко и ассистент кафедры медицинской психологии мединститута И.А. Карпюк), участвуют в проведении общего практикума и практикума специализации. Наша специальность так интересна, что у нас охотно работают и "смежники": доктор философских наук, профессор Ч.С. Кирвель, кандидат медицинских наук, профессор Н.Н. Павлович, кандидат медицинских наук, доцент О.М. Кириллова и др. А математические дисциплины читаются с психологическим уклоном (кандидат математических наук, доцент В.С. Немец, ст. преподаватель С.У. Шушкевич) Математики, скажем прямо, проявляют живой интерес к психологии. Преподаватели иностранных языков совместно с психологами исполняют психологические тесты для обучения.

Складывается большой творческий коллектив психологов и представителей смежных наук, их объединяет интерес и любовь к самой гуманической науке - психологии.

## ЗАВТРА...

Бодрое начало этой статьи вовсе не означает, что я спокойна, удовлетворена, довольна... Ох, нет! Нет и нет. Беспокойство, тревога, заботы. Как много надо сделать, чтобы подготовить профессионалов, которые могли бы работать в учебных заведениях, правоохранительных органах, в медицинских учреждениях, на транспорте, в армии и флоте. У нас пока всего две специализации: "Психология развития" и "Юридическая психология". Но выпускник по специальности "Психология" сможет работать психологом в любой отрасли деятельности.

Много еще проблем с разработкой таких курсов, как политическая психология, акмеология, геронтопсихология и др. С большими трудностями мы встречаемся при организации различных практик: общий психологический практикум, спецпрактикумы, учебные и производственные практикумы. Со специализацией в области психологии развития у нас все складывается удачно: лабораторно-практические занятия со студентами проводятся в своеобразных творческих лабораториях: это центр творческого развития детей (преподаватель кафедры Н.Н. Муринова, она же научный консультант центра), СШ N 13 (кандидат психологических наук, старший преподаватель П.А. Ковалевский). В ближайшее время студенты специализации в доме малютки будут не только проходить практикум, но и проводить воспитательную работу: надо стать мамами этих брошенных деток (от одного месяца до трех лет), чтобы помочь им преодолеть тяжелое психическое состояние "госпитализм", негативно влияющее на все последующее психическое развитие.

Налаживается дело и со специализацией в области юридической психологии, много желающих помочь, в т.ч. специалисты из Минска и практические работники в этой области г. Гродно. Новое это дело, нигде в вузах РБ нет такой специализации, но мы, конечно, станем на ноги.

Другая забота - организация лаборатории экспериментальной психологии. После долгих мук (ректората) удалось приобрести новейшее психологическое оборудование из Геттингена. Но дело остановилось из-за отсутствия помещения, которое скоро все-таки отремонтируют.

И, наконец, самое-самое сложное. Нам необходимо организовать Центр психологической помощи населению. Содержательно мы готовы к этому делу. И кадры имеются. Остановка была также за помещением. После ремонта отведенного нам помещения мы немедленно приступим к психологическому консультированию студентов, а затем и жителей города. Рассчитываем, что этот Центр будет базой для обучения психологическому консультированию студентов отделения.

Конечно, главную роль в развитии психологического образования в университете выполняют К.В. Вербова, Б.П. Ковалев, Т.К. Комарова, П.А. Ковалевский, Л.А. Семчук, В.С. Богословская, М.С. Гуткин, С.В. Белохвостова, Л.М. Путято, Е.В. Профатило, Л.О. Филончук. Каждый из преподавателей и аспирантов нашел свое место на кафедре, свой рабочий участок. От этих людей зависит будущее психологии в университете.

В ближайшие 1-2 года мы укрепим специализацию "Юридическая психология" и, конечно же, введем другие специализации, наиболее актуальные для нашего региона.

В следующих номерах газеты на ее "Психологической странице" будем продолжать наш разговор с читателем о психологии.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22.

*Набор і вёрстка:*
**М. ВЕРСТАК, П. БАЗЫЛЬЧЫК**

*Здадзена ў набор 20.10.97*
*Падпісана да друку: 24.10.97, 15.00*
*Заказ № 128*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, п.228.* ☎ *72-08-17.*